# КОМПЛЕКСНАЯ РАБОТА
# ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ
## 11 клас
## Варыянт 2

**Заданне 1.** Вядома, парадак павінен быць не толькі ў наваколлі, але і ў паводзінах, адносінах да жыцця. Маральным арыенцірам для людзей могуць лічыцца аўтары беларускай літаратуры, крылатыя словы якіх падказваюць нам напрамак жыцця. Прачытайце выказванні беларускіх мастакоў слова і выканайце фанетычнае заданне: пастаўце знак “+” у патрэбным слупку табліцы.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

*І ў тон адзін з зямлёю я пяю, і кожны міг сябе я пазнаю часцінкай злітаю вялікага сусвету.* (Якуб Колас)

| № п.п. | Пытанні | Так | Не |
|---|---|---|---|
| 1 | Транскрыпцыя слова *сусвету* [сусв’э́ту] правільная? | | |
| 2 | У слове *злітаю* вымаўляюцца два мяккія гукі? | | |
| 3 | Словы *з зямлёю* утвараюць адно фанетычнае слова? | | |
| 4 | У слове *пазнаю* колькасць літар і гукаў супадае? | | |
| 5 | У слове *вялікага* два зычныя гукі санорныя, адзін – шумны звонкі, адзін – шумны глухі? | | |
| 6 | У фразе 16 фанетычных слоў? | | |

**Заданне 2.** У гарадах і вёсках існуюць аб’екты, якія забяспечваюць іх жыццядзейнасць. Гэтыя аб’екты складаюць гарадскую або вясковую ***інфраструктуру***. Пастарайцеся правільна вызначыць лексічнае значэнне кожнага з інфраструктурных найменняў і спалучыце словы з левага слупка з іх значэннямі ў правым слупку. Адказ запішыце ў наступнай форме: А1Б2В3Г4Д6Е7 (звярніце ўвагу, што адна з назваў лішняя).

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

| | Значэнне слова |
|---|---|
| А | Памяшканне для работы мастака, скульптара |
| Б | Збудаванне для пераходу або пераезду цераз раку, канал, чыгунку і г.д. |
| В | Участак для адпачынку з прыроднымі ці штучнымі насаджэннямі, дарожкамі, алеямі, вадаёмамі |
| Г | Прадпрыемства, якое аказвае насельніцтву розныя бытавыя паслугі |
| Д | Перакрыцце праёма ў сцяне або пралёту паміж дзвюма апорамі, слупамі, устоямі моста і інш. |
| Е | Вялікая незабудаваная тэрыторыя ў горадзе або вёсцы |

| | Аб’ект інфраструктуры |
|---|---|
| 1 | мост |
| 2 | арка |
| 3 | перакрыжаванне |
| 4 | майстэрня |
| 5 | атэлье |
| 6 | плошча |
| 7 | парк |

| А | | Б | | В | | Г | | Д | | Е | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|

**Заданне 3.** Зладзьце добраўпарадкаванне па-беларуску, пераклаўшы з рускай мовы дзеясловы, што называюць розныя віды работ, якія могуць праводзіцца для надання розным тэрыторыям добраўпарадкаванага выгляду.

***Заўвага***. *Для дзеяслова* ***мостить*** *пераклад* ***масціць*** *не прымаецца.*

*Максімальная колькасць балаў –* ***6***.

| | | | |
|---|---|---|---|
| *штукатурить* | | *отапливать* | |
| *мостить (камнем)* | | *удобрять* | |
| *сверлить (дрелью)* | | *вспахать* | |
| *переоборудовать* | | *обтёсывать* | |
| *остеклить* | | *отскоблить* | |
| *окрашивать* | | *изваять* | |

**Заданне 4.** Бадай што самы прыемны вынік добраўпарадкавання тэрыторыі – яе азеляненне. Але высаджванне дрэўцаў не такая простая справа, бо для кожнага з іх, у залежнасці ад пароды, трэба падабраць найбольш спрыяльнае для росту месца. Важна таксама ўлічваць і як розныя віды дрэў могуць ужывацца адно каля другога, і эстэтыку іх агульнай кампазіцыі на адпаведнай тэрыторыі.

Ацаніце прапанаваную вам "тэрыторыю" (табліцу), улічваючы, якая граматычная форма дзеяслова прымеркавана да кожнага слупка. З улікам гэтага падбярыце шэсць патрэбных "дрэўцаў" (граматычных формаў), каб "пасадзіць" іх у пазначаных месцах.

**Узор:**

| | | | |
|---|---|---|---|
| |  ***еду*** | | *едзьце* |
| *рабіць* | |  ***робіце*** | |

*Максімальная колькасць балаў –* ***6***.

| | | | |
|---|---|---|---|
| | *разаўю* | |  |
|  | | *зацяжарыце* | |
| *выняць* |  | | |
| *злавацца* | | |  |
| *растаць* |  | | |
| | |  | *пад'ешце* |

**Заданне 5.** Добраўпарадкаванне – гэта імкненне не толькі да парадку, але і да міру, ладу, утульнасці, да сувязі пакаленняў і пераемнасці традыцый. Прачытайце урывак з рэкламы па добраўпарадкаванні прыдамавых тэрыторый. Запоўніце табліцу, упісаўшы ў правы слупок словы (словазлучэнне) у адпаведнай граматычнай форме згодна з пазначанымі ў левым слупку іх характарыстыкамі.

*Максімальная колькасць балаў –* ***6***.

*Добраўпарадкаванне тэрыторый – гэта мастацтва пераўтварэння ўчастка, якое надасць унікальны характар кожнаму дому. Наша студыя падыходзіць да гэтага працэсу з поўнай адказнасцю і творчасцю, ствараючы ўнутраныя прыгожыя і функцыянальныя* ***двары****. Асаблівая ўвага надаецца добраўпарадкаванню*

*прыдамавых тэрыторый у Мінску і ўсёй Беларусі, дзе архітэктурнае аблічча і высокія стандарты жыцця патрабуюць персаналізаванага і творчага падыходу да праекта. Мы ўлічваем асаблівасці ўчастка, таму нашы праекты добраўпарадкавання заўсёды распрацоўваюцца індывідуальна, адлюстроўваючы як спецыфіку мясцовасці, так і пажаданні заказчыка.*

| | | |
|---|---|---|
| 1 | Прыметнік, утвораны ад прыслоўя | |
| 2 | Азначальны займеннік | |
| 3 | Рознаспрагальны дзеяслоў | |
| 4 | Назоўнік, утвораны нульсуфіксальным спосабам | |
| 5 | Член сказа, якім з’яўляецца выдзеленае слова | |
| 6 | Часціца | |

**Заданне 6.** Добраўпарадкаванне горада, несумненна, пачынаецца з ачышчэння. У сувязі з гэтым мы прапануем вам “ачысціць” ад памылак паведамленні, размешчаныя на рэкламных шчытах. Дапамажыце выявіць, патлумачыць і паправіць дапушчаныя памылкі. Улічыце, што сярод прапанаваных могуць быць як сказы з памылкамі, так і правільныя сказы. Калі памылак няма, то напішыце “Няма памылак”.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

| № сказа | Сказ |
|---|---|
| **1** | Людзі, якім патрэбна ваша дапамога… Звесткі пра іх глядзіце на сайце X ва ўкладцы “Дабрачыннасць”. Інфармацыя абнаўляецца кожныя два тыдня. |
| **2** | Мы помнім і прыносім даніну павагі героям. |
| **3** | Прафесія, якая дазваляе павышаць кругагляд, дае магчымасць глыбей разумець свет вакол сябе… |
| **4** | Спарткомплекс “Раўбічы”. Пад’язджаючы да Мінска, добра бачны яго трампліны. |
| **5** | Лячэбны санаторый N – цудоўнае месца для адпачынку! |
| **6** | Заняткі спортам адыгрываюць важную ролю ў фізічным і псіхічным развіцці людзей. Спартыўны комплекс Q чакае наведвальнікаў! |

| № сказа | Тлумачэнне памылкі (пры яе наяўнасці) | Выпраўлены варыянт сказа |
|---|---|---|
| **1** | | |
| **2** | | |
| **3** | | |
| **4** | | |
| **5** | | |
| **6** | | |

**Заданне 7.** Перакладзіце тэкст на беларускую мову.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

Ежегодно в срок до 1 октября местные исполнительные и распорядительные органы согласовывают определенные специализированными организациями площадки складирования снега в соответствии с законодательством об охране окружающей среды при условии размещения их в местах с преимущественно глубоким залеганием грунтовых вод и недопущения попадания талых вод в водные объекты, на озелененные территории, природные территории, подлежащие специальной охране. *(По материалам интернет-ресурсов.)*

______________________________________________________________________
______________________________________________________________________

*Уявіце, што Вы трапілі ў Белы Горад, у якім усё так або інакш звязана з літаратурай. Пастарайцеся зразумець яго жыццё. Для гэтага спатрэбяцца веды з тэорыі, гісторыі літаратуры і ўласная творчая фантазія.*

**Заданне 8.** Ваша першая задача – размеркаваць на праспекце Тэорыі чатыры прыпынкі грамадскага транспарту (Рамантызм, Рэалізм, Барока, Мадэрнізм) у той паслядоўнасці, у якой гэтыя напрамкі з’яўляліся ў мастацтве (першы прыпынак – самы блізкі да “Дэпо”). Другая задача – размясціць на кожным прыпынку па два элементы афармлення, якія найбольш адпавядаюць яму.

Запішыце ў адведзеным полі над ліхтаром назву прыпынку і пад транспартнай лініяй нумары элементаў афармлення для яго. Лішнія элементы змясціце ў “Дэпо”.

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

**Элементы афармлення:**

1. Мазаіка з цытат з мастацкіх твораў розных эпох
2. Аўтамат для продажу паштовак з выявамі сімвалаў з твораў М. Багдановіча, З. Бядулі, У. Дубоўкі
3. Партрэт Сімяона Полацкага ў незвычайнай дэкарыраванай раме з выгнутымі лініямі
4. Барэльеф Францішка Багушэвіча
5. Вітраж з выявамі Машэкі і Наталькі
6. Антычныя скульптуры багоў у нішы з калонамі
7. Цытаты з “Ліста да Абуховіча” і “Прамовы Мялешкі”
8. Фрагмент дэкларацыі арганізацыі “Маладняк”
9. Шарж з подпісам “Пісар Кручкоў”
10. Скульптурная кампазіцыя герояў твораў Адама Міцкевіча



**Заданне 9.** У Белым Горадзе плануецца пабудаваць квартал “Жанры”, дзе кожны дом будзе мець назву па адным з літаратурных жанраў і будзе аздоблены цытатай з твора гэтага жанру. Каб дапамагчы аздобіць дамы, прааналізуйце прапанаваныя цытаты і вызначце аўтара радкоў, назву твора, з якога ўзята цытата, жанр гэтага твора.

**Цытата 1**

**Данілка.** Самі з сабой пойдзем: ты з малымі, я з скрыпачкай. У свет, мамачка, па хату і хлеб пойдзем. Я буду іграць, ты пяяць, а малыя сваім плачам памагаць нам будуць. І такую вандроўку пачнём, якая яшчэ нікому і не снілася! Ад вёскі да вёскі пойдзем, ад двара да двара – аж у вялікі горад зойдзем, кажуць, ёсць такія гарады, ці месты, дзе дамы ўсе чыста, як печы, – з цэглы мураваныя, а народу там шмат, шмат!

**Цытата 2**

Шыковіч працаваў у сховішчы, якое змяшчалася ў склепах былога аддзялення банка. Прасторныя сухія склепы. У першы пасляваенны год камсамольцы разабралі банкаўскія руіны і са старой цэглы на месцы трохпавярховага будынка змуравалі невялікі аднапавярховы асабняк. Рэканструкцыя горада не кранула яго, бо стаяў ён у глыбіні двара, пасярод квартала. Наперадзе вырас чатырохпавярховы дом. А гэты белы домік стаяў у абкружэнні таполяў. Пасаджаныя ў сорак пятым годзе, яны разрасліся ў густы цяністы сквер і ўсё навокал засыпалі пухам квецені.

**Цытата 3**

А ўранні ў святы дзень устаць і ў лес пайсці, грыбоў насабіраць (мо леснікі не абдзяруць), а потым – у царкву, у госці пайсці, а вечарком, скрыпку ўзяўшы, на вуліцы пад хатай пасядзець, сыграць скокі-танцы ды песні-весялушкі розныя. Іграе Іван на гармоніку, а Цімох на дудцы мастак; танцуе студэнт з дзяўчынкамі-хахатушкамі, сарамліва-смелымі, здарова-прыгожымі.

Ідзе час, зараз да горада рыхтавацца пара... Сумна тады робіцца.

А толку пра зданнё страхаццё так і няма. І бацька з сынам неахвотна гаворыць ужо пра тое. Баіцца за сына ядынага, дрыжонага. Бо баіцца стары, што надта пачаў цікавіцца сынок незразумелым, таемным, страшным, незямным.

**Цытата 4**

Лабановіч на хвіліну задумаўся.

– Прызнацца, я ніколі не цікавіўся гэтым пытаннем. Тут, на Палессі, дзе людзей сустракаеш мала, можа, і задумаешся над кожным чалавекам, які ні пяройдзе перад тваімі вачамі. Але ў горадзе, дзе не паспяваеш больш-менш стала заўважыць твар кожнага стрэчнага, я думаю, што гэта проста немагчыма. Можа, дзе ў мазгах гэты працэс і выяўляецца, але ў нашай свядомасці ён дапраўды не адбіваецца.

| Цытата | Аўтар | Назва твора | Жанр твора |
|---|---|---|---|
| Цытата 1 | | | |
| Цытата 2 | | | |
| Цытата 3 | | | |
| Цытата 4 | | | |

**Заданне 10.** Летам 2027 года ўвесь Белы Горад збіраецца святкаваць 110-годдзе з дня нараджэння аднаго з самых вядомых беларускіх паэтаў. Ён нарадзіўся ў Рэвелі (цяпер Талін), але дзяцінства правёў у Беларусі. Атрымаў настаўніцкую адукацыю. Большую частку жыцця прысвяціў працы ў рэдакцыях літаратурна-мастацкіх газет і часопісаў. Яго кнігі “Пры святле маланак”, “Крык сойкі” ўвайшлі ў залатую скарбонку беларускай паэзіі XX стагоддзя.

Вы як адзін з найлепшых знаўцаў беларускай літаратуры былі запрошаны ў каманду, што распрацоўвае канцэпцыю літаратурнага афармлення гарадской прасторы (графіці, муралы, светлавыя інсталяцыі, іншае), заснаваную на **адным** літаратурным творы пісьменніка, юбілейную дату якога збіраюцца святкаваць жыхары Белага Горада. Вам неабходна выканаць некалькі заданняў.

1. Запішыце імя пісьменніка, юбілейную дату якога рыхтуюцца святкаваць жыхары Белага Горада, і назву твора, на аснове якога Вы мяркуеце афармляць гарадскую прастору.
2. Коратка апішыце 2 аб’екты афармлення. Патлумачце, як Ваша ідэя афармлення звязана з ідэяй выбранага Вамі твора. Для афармлення выбірайце прынцыпова розныя аб’екты і аформіце іх па-рознаму.
3. Апішыце (да 100 слоў), як ідэя афармлення гарадской прасторы ў сувязі з выбраным Вамі творам паўплывае на ўспрыманне горада жыхарамі і гасцямі.
4. Прывядзіце 2 цытаты з **гэтага** твора, што будуць высечаны на помніку пісьменніку, адкрыццё якога запланавана ў дзень святкавання 110-годдзя. Патлумачце адным-двума сказамі, чаму Вы выбралі менавіта гэтыя цытаты (тлумачэнне павінна быць на кожную цытату асобна).

*Максімальная колькасць балаў – **6**.*

| | |
|---|---|
| **Імя пісьменніка** | |
| **Назва твора** | |

## Аб’екты афармлення

| Аб’екты афармлення, як яны будуць аформлены | Як ідэя афармлення звязана з ідэяй выбранага твора |
|---|---|
| | |
| | |

## *Ідэя афармлення гарадской прасторы*

______________________________________________

______________________________________________

## Цытаты на помнік

| Цытата | Тлумачэнне, чаму менавіта гэтыя радкі трэба змясціць на помніку |
|---|---|
| | |
| | |